# Глава VIII. САСЛОЎНАЕ І БЕССАСЛОЎНАЕ САМАКІРАВАННЕ Ў БЕЛАРУСІ

## 8.1. Дваранскае самакіраванне

*(А. П. Жытко)*

Важную ролю ў сістэме мясцовага кіравання адыгрывалі органы саслоўнага (дваранскага і сялянскага) і бессаслоўнага (гарадскога і земскага) самакіравання. На падставе зацверджанай 21 красавіка 1785 г. даравальнай «Грамоты на права, вольнасти и преимущества благородного российского дворянства»[1] была створана **саслоўная дваранская карпарацыя**. Вышэйшае саслоўе атрымала поўнае самакіраванне, практычна ўсю павятовую і некаторую частку губернскай улады. Заканадаўства па гэтых пытаннях з некаторымі зменамі захавалася да 1917 г. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі такія ж правы былі нададзены і набілітэту Беларусі.

Закон прадугледжваў пагубернскую арганізацыю вышэйшага саслоўя. Вышэйшымі распарадчымі органамі таварystваў з'яўляліся губернскія і павятовыя сходы. Павятовыя сходы звычайна займаліся падрыхтоўкай да губернскіх: праверкай спісаў дваран павета, высвятленнем іх выбарчых правоў, папярэднім абмеркаваннем асобных пытанняў і г. д. Усе вышэйшыя карпаратыўныя справы вырашаліся на губернскіх сходах. На іх заслухоўваліся справаздачы аб выкананні прынятых раней пастаноў, зацвярджаліся зборы на прыватныя дваранскія патрэбы, выбіраліся ўсе службовыя асобы карпаратыўных органаў: губернскія і павятовыя прадвадзіцелі, дэпутаты і сакратары дваранскіх дэпутацкіх сходаў, засядацелі дваранскіх апек, кандыдаты для замяшчэння шэрагу выбарных пасад па мясцовым кіраванні. Ім належала права – і гэта лічылася адной з важнейшых прывілей – падаваць праз губернскіх прадвадзіцелей ці дэпутатаў прашэнні ці скаргі губернскаму начальству, міністрам і непасрэдна імператару[2].

Прадвадзіцелі дваранства з'яўляліся адным з важнейшых інстытутаў і ў дваранскай саслоўнай арганізацыі, і ў сістэме мясцо-

[1] ПСЗРИ. Собр. 1-е. – Т. 22 (1784–1788). – № 16187. – С. 344–358.

[2] Жытко, А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. – С. 202.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ